***П.В. Баравік***
БДЭУ (Мінск)

# УКЛАД БРАНІСЛАВА ТАРАШКЕВІЧА У СТАНАЎЛЕННЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч нарадзіўся 20 студзеня 1892 г. у сялянскай сям'і ў вёсцы Мацюлішкі Віленскага павета. Вучыўся ў пачатковай школе ў мястэчку Лаварышкі, потым у другой Віленскай гімназіі, якую скончыў з сярэбраным медалём. З 1911 года вучыўся на гістарычным факультэце Пецярбургскага універсітэта, які скончыў ў 1916 г. Філалагічную падрыхтоўку ён атрымаў пад кіраўніцтвам акадэмікаў А.А. Шахматава і Я.Ф. Карскага. Пасля заканчэння ўніверсітэта Б.А. Тарашкевіч застаўся працаваць ва ўніверсітэце выкладчыкам рускай мовы і літаратуры. З восені 1918 г. Б.А. Тарашкевіч жыў і працаваў у Беларусі і Літве. У 1919 годзе быў прызначаны дырэктарам беларускай гімназіі ў Вільні. Пасля таго як заходнебеларускія землі перайшли пад уладу Польшчы, Б.А. Тарашкевіч стаў членам Цэнтральнага беларускага выбарчага камітэта. У 1922 годзе ён быў абраны паслом (дэпутатам) польскага сойма, а ў лістападзе гэтага ж года ўзначаліў Беларускі пасольскі клуб, які вёў барацьбу за раўнапраўе беларусаў у Польшчы. У перыяд сваёй парламенцкай працы востра крытыкаваў з соймавай трыбуны нацыянальную і сацыяльную палітыку польскага ўрада. На працягу шэрагу гадоў Б.А. Тарашкевіч узначальваў Беларускае сялянска-рабочае таварыства. Цесна зблізіўся з лідэрамі Кампартыі Заходняй Беларусі і ў студзені 1926 года быў прыняты ў яе шэрагі. У 1927 годзе быў арыштаваны польскай палітычнай паліцыяй і ў 1928 г. асуджаны на 12 гадоў турэмнага зняволення. Пад ціскам сусветнай грамадскасці ў 1930 годзе вызвалены з турмы, а ў 1931 г. зноў арыштаваны і асуджаны на 8 гадоў катаржных работ. У 1933 г. па абмене палітвязнямі пераехаў у СССР у г. Мінск, а потым раптам перабраўся ў Маскву, дзе быў прызначаны загадчыкам аддзела Польшчы і Прыбалтыкі ў Міжнародным аграрным інстытуце. У 1937 годзе арыштаваны і прысуджаны да

выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны толькі ў 1957 г. падчас хрушчоўскай адлігі.

Будучы студэнтам Пецярбургскага ўниверсітэта, Тарашкевіч актыўна займаўся навукова-даследчай дзейнасцю. Першай сваёй задачай ён лічыў стварэнне граматыкі беларускай мовы. У 1918 г. у Вільні была апублікавана яго праца "Беларуская граматыка для школ», якая іграла важную практычную і навуковую ролю. У сваёй працы аўтар абапіраўся на жывую народную гаворку і на пісьмовыя стылі таго часу. У кнізе зроблена спроба прывесці да аднастайнага ўжывання новую беларускую граматычную тэрміналогію з улікам нацыянальных асаблівасцей беларускай мовы і тэрмінаў міжнароднага характару. У канцы 1928 г. Б.А. Тарашкевіч быў абраны ў склад членаў Акадэміі Навук БССР. Гэта высокае званне ён цалкам заслужыў, дзякуючы сваім лінгвістычным і філалагічным працам, хоць не ўсё напісанае ім убачыла свет.

У гады турэмнага зняволення Б.А. Тарашкевіч пераклаў на беларускую мову такія выдатныя творы, як «Іліяда» Гамера і паэму «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча.

Дзякуючы перакладам Б.А. Тарашкевіча, мы маем магчымасць атрымліваць задавальненне ад багацця беларускай літаратурнай мовы, бо гэты чалавек перанёс на паперу і сістэматызаваў народную гаворку, фактычна стварыўшы літаратурную беларускую мову. Дзякуючы яму, мы пераканаліся, што на беларускай мове з дастатковай сэнсавай дакладнасцю і мастацкай выразнасцю могуць гучаць самыя выбітныя літаратурныя творы сусветнай класікі.